# САМАСТОЙНАЯ ПРАЦА ПА ТЭМЕ “НАВУКОВЫ СТЫЛЬ І ЯГО АСАБЛІВАСЦІ”

**1. Выкарыстоўваючы дадзеныя словы і словазлучэнні, скласці сказы ў навуковым стылі.**

Лекцыя выкладчыка, рэпартаж, дысертацыя, справаздача, міжнароднае камюніке, службовая характарыстыка, дыпламатычная нота, прамова на мітынгу, манаграфія, вучоныя запіскі, угалоўны кодэкс, судовы іск, вайсковая прысяга, рэцэнзія на спектакль; параметры арбіты, тэлевізійны фільм, кніжны фонд, навуковая канферэнцыя; элементарная геаметрыя, матэматычныя пазнанні, графічныя метады, вышэйшая матэматыка; ахова прыроды, жывёльны і раслінны свет, арганізацыя відавой аховы раслін і жывёл, антрапагенныя фактары, пагроза знікнення; рукапісныя матэрыялы, творчая лабараторыя, празаічныя і паэтычныя творы, каліграфічны почырк, мастацкае слова, творчы вопыт, айчынная літаратура, крылатае народнае слова.

**2. Пісьмова прывядзіце прыклады сказаў у навуковым стылі, выкарыстоўваючы пабочныя словы і сказы.**

Безумоўна, бясспрэчна, сапраўды, зразумела, вядома, натуральна, на самай справе; напэўна, мабыць, відавочна, як відаць, трэба думаць, здаецца, прыблізна; па-першае, па-другое, па-трэцяе, нарэшце, такім чынам, наадварот, насупраць, у прыватнасці, скажам; кажуць, як кажуць, як паведамлялася ўжо, па-мойму, па-вашаму, паводле атрыманых звестак, на маю думку, з пункту гледжання і інш.

**3. Выкарыстоўваючы злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі, складзіце і запішыце складаназлучаныя сказы ў навуковым стылі.**

Каб, калі, пакуль, таму што, тым часам як, для таго каб, то – то, ці то – ці то, ні – ні, не то – не то, не толькі – але і, калі – то, як – так і, хоць і – але і інш.

**4. Вызначце стыль тэксту, тып тэксту; назавіце лексічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя асаблівасці дадзенага тэксту.**

А) Планеты зямной групы першапачаткова былі адносна халодныя, а пасля іх нетры паступова разаграваліся ад цяпла, якое вылучаецца пры распадзе радыёактыўных элементаў, што ёсць у невялікай

колькасці ва ўсіх пародах. Гэта прывяло да выплаўлення кары і выдзялення газаў і пары. Газы і пара Месяца, Меркурыя і Марса поўнасцю або ў значнай меры рассеяліся ў прасторы, на Зямлі ўтварылі атмасферу і гідрасферу, а на Венеры – толькі атмасферу. Развіццё фізікі і астрафізікі ў 20-ым ст. дало магчымасць пачаць вывучэнне паходжання і эвалюцыі зорак і зорных скопішчаў. Большасць даследчыкаў зорнай касмагоніі дапускае, што зоркі ўтвараюцца з газава-вадародных туманнасцей і выпраменьваюць за кошт працэсаў гравітацыйнага разагрэву і тэрмаядзернага сінтэзу. (БелСЭ. Мінск)

Б) Амінакіслоты, арганічныя (карбонавыя) кіслоты, якія змяшчаюць адну або некалькі амінагруп (NH2). Складаюць асноўную структурную частку малекул бялкоў. Адыгрываюць важную ролю ў абмене рэчываў, забяспечваюць сінтэз ферментаў, нуклеінавых кіслот, гармонаў і іншых біялагічна актыўных злучэнняў. Большасць амінакіслот можа сінтэзавацца ў арганізме жывёл і чалавека, частка іх не сінтэзуецца і павінна паступаць з кормам. Нястача незаменных амінакіслот у арганізме парушае абмен рэчываў і вядзе да захворванняў жывёлы.(Вет. Энц.)

**5. Перакладзіце урывак з лінгвістычнай працы К. С. Аксакава на беларускую мову. Сфармулюйце коратка асноўную думку тэксту. Вызначце тып тэксту. Назавіце лексічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя асаблівасці тэксту.**

Всё, что существует, существует где-нибудь и когда-нибудь, другими словами, в пространстве и во времени. Под этими двумя формами предстала природа в понятии человека: под формою пространства как предмет, под формою времени как действие. В слове человеческом как отражении человеческого понятия повторилось то же самое, а потому оно разделилось на две основные части речи – на имя (предмет) и на глагол (действие). Каждая из этих частей речи, будучи сама по себе общею, имеет свои дальнейшие определения, естественно возникающие в её сфере. Человек отвлекает от природы и от действия качество, и вот в слове качество (определение) имени выразилось прилагательным, качество глагола – наречием. Предметы имеют влияние один на другой, относятся один к другому точно так же, как и действия; итак, в слове отношение между предметами, именами высказывается предлогом, отношение между действиями – союзом. Вот определение частей речи, которое кажется нам верным и основанным на общих законах разума.

Остаётся сказать нам, как понимать местоимение, причастие, деепричастие, междометие, которые принимались прежде за отдельные части речи.

Местоимение никак не составляет отдельной части речи. Местоимение личное должно быть отнесено к имени; оно также обозначает предмет (принимая в обширном значении это слово). Все остальные роды местоимений относятся к прилагательному. Причастие, очевидно, не может составить особенной части речи: это отглагольное прилагательное. Деепричастие также есть отглагольное наречие. От простого прилагательного и наречия отличает их только то, что они сохраняют глагольное управление.

**6. Падрыхтуйце невялікі тэкст у навуковым стылі, затым у размоўна-гутарковым на тэму “Будучая прафесія”. Параўнайце суадносіны назоўнікаў і іншых часцін мовы ў абодвух тэкстах.**

**7. Прачытайце тэкст. Вызначце стыль і тып тэксту. Дайце яму загаловак. Выпішыце асобна канкрэтныя і абстрактныя назоўнікі. У вытворных назоўніках вызначце словаўтваральныя суфіксы.**

Ці думалі вы пра беларусаў не як пра сваіх бацькоў, братоў і сёстраў, сяброў і аднавяскоўцаў, а як увогуле пра людзей з асобным характарам? Ці задумваліся, які ён, беларус? Што гэта за народ? Давайце паразважаем разам.

Рысы аблічча беларуса мяккія, склад здаецца крыху далікатным, хоць для беларуса характэрна працавітасць, вынослівасць, цягавітасць. Там, дзе другі можа апусціць рукі, беларус будзе цягнуць. Іначай, у старыя часы, чалавек проста не выжыў бы сярод гэтых дрымучых лясоў і неабсяжных балот. І гарт той застаўся ў яго характары на вякі.

Манера паводзін вызначаецца павольнасцю, стрыманасцю. Праўда, стрыманасць беларуса да пары. Пяройдзеш мяжу – і беларус пакажа, як паказаў у мінулай вайне, чаго ён варты, калі вораг падніме руку на яго жыццё.

Уласціва нашым людзям знаходлівасць. Беларус – вялікі аматар пажартаваць, ён не можа абысціся без гумару. Беларусы адрозніваюцца шчодрасцю, заўсёднай гатоўнасцю прыйсці на дапамогу ў бядзе. Яны звычайна мяккія, даверлівыя, пазбаўленыя помслівасці. Галоўнае ў нашым характары – гасціннасць да добрых людзей. Па агульным назіранні беларусам уласцівая павага да іншых народаў і памяркоўнасць да таго, хто думае іначай. (*Паводле У.Караткевіча)*